**В. С. Іванова,**
*дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта,*
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт;*
e-mail: ivanova.volga.s@gmail.com

**А. М. Латушкін,**
*дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта,*
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт;*
e-mail: andrei.latushkin1@gmail.com

# МЕТАД АРХІЎНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ Ў АРХІЎНАЙ СПРАВЕ І НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯХ

Паняцце рэканструкцыі выкарыстоўваецца ў шэрагу тэхнічных (архітэктуры, інжынерыі, крыміналістыцы) і гуманітарных (гісторыі, археалогіі, мастацтвазнаўстве, лінгвістыцы, філасофіі) дысцыплін. Яно можа разглядацца як працэс, метад ці сукупнасць метадаў. Працэс рэканструкцыі — гэта ўзнаўленне таго, што было страчана ці разбурана. У залежнасці ад дысцыпліны гэта могуць быць розныя аб'екты, пачынаючы ад будынкаў і заканчваючы гістарычнымі працэсамі, моўнымі формамі ці філасофскімі ідэямі. У расійскім акадэмічным тэрміналагічным слоўніку даецца вызначэнне паняцця «гістарычная рэканструкцыя» як працэсу ўзнаўлення мінулага, яго адлюстравання ці стварэння яго навукова-абгрунтаванага вобраза. Метад рэканструкцыі, на думку аўтараў слоўніка, — універсальны метад гістарычнага даследавання, які выкарыстоўваецца ў дапаможных гістарычных дысцыплінах для ўзнаўлення канкрэтных аб'ектаў матэрыяльнай ці духоўнай культуры, карціны, фактаў і з'яў мінулага і іншага, абапіраючыся на фрагментарныя звесткі. Вылучаюцца некалькі відаў гістарычнай рэканструкцыі: эмпірычная і тэарэтычная, рэальная і ідэальная, злучальная і дабудоўваючая, поўная і частковая [19, с. 432—435].

У найбольш шырокім значэнні архіўная рэканструкцыя — гэта працэс аднаўлення даных, дакументаў ці комплексаў дакументаў, якія мелі месца ў мінулым. Калі разглядаць архівазнаўства як дапаможную гістарычную дысцыпліну, можна казаць пра гістарычную рэканструкцыю на падставе часткова захаваўшыхся архіўных дакументаў. Аднак ужо з канца XIX ст. архівазнаўства набыло самастойнае значэнне. Былі сфармуляваны яе асноўныя прынцыпы і метады*. Не адмаўляючы магчымасцей разгляду архіўнай рэканструкцыі як працэсу ці сукупнасці метадаў, у межах дадзенага артыкула будзе разглядац-

* Метад у дадзеным значэнні, паводле вядомага крыніцазнаўцы І. Д. Кавальчанкі, — гэта тэарэтычна абгрунтаваны нарматыўны пазнавальны сродак, што ўключае ў сябе сукупнасць шляхоў, прынцыпаў, патрабаванняў, нормаў, правілаў, працэдур і інструментаў, якія забяспечваюць узаемадзеянне суб'екта з вывучаемым аб'ектам з мэтай рашэння пастаўленай даследчай задачы [8, с. 39—40].

ца метад архіўнай рэканструкцыі як асноваўтваральны ў архівазнаўстве, што афармляе ў адзінае цэлае яго асноўныя тэарэтычныя палажэнні.

Архіўная рэканструкцыя па сваёй тэарэтычнай прыродзе грунтуецца на класічным прынцыпе правеніенцыі (паходжання), сфармуляваным нідэрландскімі архівістамі ў канцы XIX ст. і атрымаўшым усеагульнае прызнанне на Міжнародным кангрэсе бібліятэкараў і архівістаў у Брусэлі ў 1910 г. Тады Самюэль Мюлер вызначыў прынцып правеніенцыі як «архіўнае правіла, згодна з якім кожны дакумент уключаецца ў архіўны фонд і ў тую частку фонду, да якой ён належаў падчас дзейнасці арганізацыі» [23]. Было сказана аб захоўванні дакументаў у той інфармацыйнай сукупнасці, у якой яны былі створаны (фонд), і ў тым парадку, які адлюстроўваў бы дзейнасць, структуру альбо біяграфію яго стваральніка. Па першым пункце ў архівістаў не было істотных разыходжанняў з часоў Наталіса дэ Вайі і нарматыўнага ўвядзення прынцыпу «павагі да фонду» для абавязковага выканання ў французскіх архівах у 1841 г. У першай палове XX ст. гэты аспект быў дапрацаваны савецкімі архівістамі, якія сфармулявалі правіла «непадзельнасці фонду», якое азначала, што комплекс дакументаў адной арганізацыі або асобы павінен захоўвацца ў адным фондзе і адным архіве. Другі аспект — унутранай структуры або ўнутранага парадку фонду, і дапушчальныя межы ўплыву архівістаў на яго — выклікаў шэраг дыскусій, спектр якіх вар'іраваўся ад неабходнасці захавання жорсткага ўнутранага парадку, створанага ў самой арганізацыі, да неўмяшання архівістаў у працэсы ўнутранай сістэматызацыі (павага да фонду, прынцып вольнай правеніенцыі). Класічным заставаўся і застаецца падыход, пры якім для эфектыўнай сістэматызацыі неабходна аднаўленне гістарычнай структуры фондаўтваральніка праз правядзенне асобнага архівазнаўчага даследавання (С. Мюлер).

Пазней для вырашэння актуальных для канкрэтнага перыяду задач з'явіліся разнавіднасці прынцыпу правеніенцыі. Напрыклад, прынцып павагі да гістарычна склаўшыхся збораў, які звяртаў увагу на неабходнасць захавання ў адзіным комплексе не толькі дакументаў як арганічнага выніку дзейнасці адной арганізацыі або асобы, але і іншых збораў, сфарміраваных у адпаведнасці з іншымі мэтамі і па іншых асновах. Варта адзначыць і прынцып тэрытарыяльнай прыналежнасці, які ў міжваенны час стаў пэўным базісам для фарміравання нацыянальнага архіўнага фонду новаўтвораных дзяржаў [31, s. 40—43; 32, s. 52—55, 83; 35], а таксама найноўшы падыход, што атрымаў назву мульціправеніенцыя, які звязвае канкрэтны дакумент не толькі з яго стваральнікам, але і з любымі іншымі аспектамі яго захоўвання або выкарыстання. У апошні час канцэпцыя паходжання стала шырока распаўсюджвацца і выкарыстоўвацца ў многіх дысцыплінах (права, бібліятэказнаўства, інфарматыка і інш.) і напрамках (аблокавых тэхналогіях, захоўванні лічбавых дакументаў, адкрытых даных, навуцы аб даных), а таксама як асаблівы прынцып міжнароднай арганізацыі ведаў [6]. Нягледзячы на тое што гэтыя дысцыпліны маюць розныя пункты гледжання на канцэпцыю паходжання, сярод іх была вызначана агульная рыса —

роля паходжання ў вызначэнні арыгінальнасці аб'екта (дакумента, прадмета) пры ўзрастаючай ролі інфармацыйных тэхналогій.

Архіўная рэканструкцыя (рэканструкцыя архіўнага фонду, рэканструктыўны метад, метад рэстаўрацыі, метад рэканструкцыі архіўнага фонду) з'яўляецца лагічным працягам прынцыпу правеніенцыі і звяртае ўвагу на спосабы і механізмы аднаўлення розных дакументальных комплексаў (пераважна фонду ці архіва ўжо неіснуючай арганізацыі) у іх самым шырокім значэнні. Як і сам прынцып правеніенцыі, падыходы да архіўнай рэканструкцыі зведалі пэўную эвалюцыю, пачынаючы з канца XIX ст. Напрыклад, у Польшчы паняцце абмяркоўвалася на IV Усеагульным з'ездзе гісторыкаў у Познані ў 1925 г. Тады пад рэканструкцыяй найперш разумелася ўзнаўленне ўнутранага парадку працы канцылярыі, згодна з якім павінна адбывацца сістэматызацыя дакументаў фонду. Юзэф Сяменьскі вылучыў 4 аб'екты рэканструкцыі: рэканструкцыя парадку кіравання напачатку працы ўстановы ці парадку кіравання напрыканцы працы ўстановы, рэканструкцыя першапачатковай архіўнай сістэматызацыі ці актуальнай архіўнай сістэматызацыі. Адным з вынікаў вывучэння і рэканструкцыі архіўных фондаў, на думку польскіх архівістаў, магло быць вяртанне дакументаў польскага паходжання з-за мяжы ці іх збіранне ў прыватных асоб [27; 29, s. 145]. Па меркаванні Рычарда Пшэласкоўскага, архіўная рэканструкцыя зводзілася да двух дзеянняў: вызначэння, да якога фонду адносіцца дадзены дакумент, і вызначэння, у якім месцы фонду ён павінен знаходзіцца, што цалкам адпавядала прынцыпу правеніенцыі. Рэканструкцыйныя працы ён падзяляў на два этапы: вывучэнне гісторыі арганізацыі і функцый установы і вывучэнне структуры канцылярыі. А таксама вылучаў два асноўныя віды рэканструкцыі: рэальную і ідэальную [31].

У савецкай гістарыяграфіі гэтае пытанне было ўпершыню ўжыта ў працы В. Маякоўскага «Аб рэканструкцыі архіўных фондаў» у канцы 1920-х гг., дзе рэканструкцыя разумелася як «узнаўленне правільнай структуры і складу архіўнага фонду праз уз'яднанне выпадкова падзеленых частак аднаго арганічнага цэлага ці раз'яднання няправільна злучаных частак розных фондаў, якія пазбаўлены арганічнай сувязі» [цыт. па: 11, с. 5]. Паняцце тлумачылася і ў падручніках Г. А. Князева, Н. Ф. Бельчыкава, К. Г. Міцяева, пазней у працах С. О. Шміта і сучасных абагульняючых працах І. А. Курляндскага, А. В. Молахава, Т. Н. Лапцевай і іншых.

У 1930-я гг. Г. М. Чаброў, які разглядаў архіўную рэканструкцыю як метад сістэматызацыі фонду, прапанаваў два асноўныя падыходы: метад рэстаўрацыі — для ўзнаўлення раней існуючага парадку ўнутры фонду, і метад рэканструкцыі, які прапаноўваў новую ўнутраную структуру фонду замест ранейшай неэфектыўнай. Гэтыя метады (метад), на думку аўтара, давалі магчымасці больш эфектыўнага выкарыстання дакументаў для патрэб краіны, вывучэння архіўнага дакумента як гістарычнай крыніцы, а таксама даведачна-інфармацыйнага забеспячэння карыстальнікаў [22, с. 67]. Ва ўкраінскім

падручніку па архівазнаўстве 1932 г. таксама пазначаліся два метады сістэматызацыі: метад правеніенцыі (для ўзнаўлення сістэматызацыі дакументаў, нададзенай ім ва ўстанове) і прынцып зместу (упарадкаванне дакументаў па тэмах, калі магчымасці для ўзнаўлення фондавай структуры адсутнічаюць) [4]. Н. А. Фамін бачыў асноўную «задачу архівазнаўства ў тым, каб не толькі прыняць сістэму пабудовы фонду, якая ўстаноўлена ва ўстанове, але і ў тым, каб праз аналіз дакументальных даных устанавіць натуральную ўзаемасувязь дакументаў» [21, с. 84].

У 1960—1970-х гг. У. М. Аўтакратаў упершыню прапанаваў магчымасць гіпатэтычнага ўзнаўлення сукупнасці справаводных дакументаў, якія адкладаліся ў выніку дзейнасці ўстановы фондаўтваральніка. Пры гэтым ён падкрэсліваў, што фізічнае ўзнаўленне страчаных дакументаў для вяртання цэласнасці Дзяржаўнага архіўнага фонду пасля вайны — гэта іншая, але не менш актуальная задача [2]. Пры апісанні метадаў архівазнаўства У. М. Аўтакратаў прапанаваў так званы актуалістычны метад (як разнавіднасць метаду гістарычнага), заснаваны на вывучэнні сучаснага стану прадмета і яго папярэдняй структуры. Гэты метад, на думку аўтара, даваў магчымасці для гіпатэтычнай рэканструкцыі былых дакументальных сістэм, вызначэння іх папярэдніх аб'ёмаў і генетычных сувязяў, а таксама для ўдасканалення навукова-даведачнага апарату, вызначэння характару страт, пошуку раскіданых ці страчаных дакументаў і інш. [1, с. 24].

У 1970-я гг. польскі архівазнаўца Станіслаў Наўроцкі ўпершыню ў польскай гістарыяграфіі прапанаваў разглядаць архіўную рэканструкцыю як метад надання парадку дакументам праз узнаўленне ўнутранай структуры арганізацыі-фондаўтваральніка на падставе захаваўшыхся звестак (інвентароў, апісанняў і інш.) ці стварэння іншай сістэмы на падстве існуючых дакументаў ці фрагментарнай інфармацыі (так званы прынцып вольнай правеніенцыі). С. Наўроцкі лічыў метад рэканструкцыі «найбольш рэпрэзентатыўным для метадаў, што выкарыстоўваюцца ў архівах» і метадам, які «адрознівае архівазнаўства ад іншых навук» [28, s. 32—33].

Паняцце «рэканструкцыя архіўнага фонду» было замацавана ў шэрагу архіўных слоўнікаў у двух асноўных значэннях: аднаўлення асноўнага зместу часткова або цалкам страчанага архіўнага фонду ў яго першапачатковым або блізкім да першапачатковага выглядзе з дапамогай ідэальнага вопісу, а таксама ўзнаўлення ў адным архіве разрозненых частак раздробненага архіўнага фонду і стварэнне яго рэальнага вопісу [18, с. 143].

Галіна Рабутка на пачатку 2000-х гг. разглядала архіўную рэканструкцыю як адзін з асноўных метадаў архівазнаўства, які можа мець розную канфігурацыю, аб'ект і этапы ажыццяўлення. Яна вылучае рэканструкцыю архіватворчых працэсаў, якая можа адбывацца праз узнаўленне працэсаў дакументастварэння і сувязяў паміж дакументамі, працы структурных адзінак установы, арганізацыі справаводнай службы, экспертызы каштоўнасці і адбо-

ру, навукова-тэхнічнай апрацоўкі. Акрамя таго — рэканструкцыю першаснай структуры фондаў існуючых ці неіснуючых устаноў, што можа ўключаць вывучэнне гісторыі арганізацыі, рэканструкцыю падзелу на адзінкі захоўвання, адбору, выбару прынцыпу сістэматызацыі, уласна сістэматызацыі, а таксама складання вопісу (уключаючы прадмову) і іншых даведнікаў. Г. Рабутка падкрэслівала, што на кожным з этапаў рэканструкцыі могуць выкарыстоўвацца ўласныя метады і тэхнікі: метад сістэмнага аналізу (пры вывучэнні структуры дакументацыі і сувязяў паміж дакументамі), метадназірання, гісторыка-генетычны метад і інш. [32, s. 52—55].

Такім чынам, у гістарыяграфіі архіўная рэканструкцыя часта разглядаецца як метад, які выконвае практычныя (сістэматызацыі, удасканаленне навукова-даведачнага апарату і інш.) і тэарэтычныя (выяўленне страт, пошук страчаных дакументаў) задачы. Метад архіўнай рэканструкцыі паўстае як асноватворны ў архівазнаўстве і дазваляе вырашаць цэлы шэраг задач. Ён з'яўляецца *комплексным:* можа выкарыстоўвацца для розных мэт, аб'ектаў, у розных канфігурацыях і праз выкарыстанне шэрагу агульнанавуковых (сістэмна-функцыянальнага аналізу, метаду гістарычнай рэтраспекцыі, мадэлявання і інш.) і прыватнанавуковых (экспертызы каштоўнасці, навуковага апісання і інш.) метадаў. Два асноўныя шляхі выкарыстання метаду архіўнай рэканструкцыі ў даваенных і пасляваенных даследаваннях фармуляваліся праз паняцце ідэальнай (гіпатэтычнай) ці рэальнай (фізічнай) рэканструкцыі. Засноўваючыся на грунтоўнай гістарыяграфіі, можна казаць аб сучасных мэтах метаду архіўнай рэканструкцыі для беларускіх архівістаў і навукоўцаў, а таксама даць характарыстыку яго магчымых аб'ектаў, відаў і этапаў.

Нацыянальны архіўны фонд Рэспублікі Беларусь на працягу сваёй гісторыі перажыў вялікую колькасць страт і рэарганізацый, таму немагчыма казаць аб яго паўнаце і цэласнасці без сувязі з іншымі дакументальнымі комплексамі і шырокага спектру прац па іх узнаўленні і рэканструкцыі. Найбольш значныя зборы, такія як Метрыка Вялікага Княства Літоўскага ці Беларускі музей імя І. Луцкевіча ў Вільні [5], уяўляюць сабой асобны гістарычны і культурны феномен, рэканструкцыя якіх дасць моцны штуршок для шэрагу навуковых даследаванняў у розных галінах, уключэння грунтоўнага комплексу дакументаў у навуковы зварот і пашырэння магчымасцей знешняй крытыкі на падставе ўзноўленых інфармацыйных сувязяў. Не выключаецца і практычная мэта ўдасканалення і павышэння інфарматыўнасці навукова-даведачнага апарату (вопісаў, шляхаводнікаў, аглядаў), у якіх сёння фактычна адсутнічаюць апісанні інфармацыйных узаемасувязяў сумежных комплексаў дакументаў, абавязковых, напрыклад, для міжнародных стандартаў архіўнага апісання. Разгляд архіўнай рэканструкцыі як асноватворнага метаду ў складзе архівазнаўства можа надаць штуршок для правядзення тэарэтычных і гістарычных навуковых архівазнаўчых даследаванняў (у тым ліку ў межах студэнцкіх прац), а таксама ўдасканаліць веды і навыкі архівістаў-практыкаў.

Выбар *аб'екта рэканструкцыі* — адна з першасных задач. Аб'ект рэканструкцыі, як правіла, мае навуковую, сацыяльна-культурную, мемарыяльную альбо палітыка-ідэалагічную значнасць, паколькі сам працэс рэканструкцыі досыць працаёмкі і патрабуе істотных матэрыяльных і чалавечых рэсурсаў, хоць асобныя яго віды або элементы шырока выкарыстоўваюцца пры выкананні вузкапрактычных архіўных задач. Аб'ект рэканструкцыі можа быць як *рэальным* — які існаваў у пэўны перыяд часу і неіснуючы цяпер, так і *ідэальным* — які не існаваў у рэальнасці і які будуецца на стварэнні ідэальнага вобраза, на аснове пэўнай ідэі або мадэлі. Напрыклад, пасля паўстання 1863—1864 гг. быў створаны так званы Музей графа М. М. Мураўёва ў Вільні, у якім збіраліся ўсе дакументы, якія адлюстроўваюць тыя падзеі. Таксама ў савецкі перыяд збіраліся архівы У. Леніна і І. Сталіна, дзе адкладалася кожнае дакументальнае сведчанне дзейнасці гэтых асоб. Да шэрагу ідэальных аб'ектаў рэканструкцыі адносяцца таксама і асабістыя архівы [7, с. 11—16, 121—128]. Рэканструкцыі могуць падлягаць фонд, архіў, сістэма архіваў, калекцыі, зборы або іншыя дакументальныя і змешаныя (уключаючы кнігі, прадметы і інш.) комплексы, якія маюць інфармацыйныя, функцыянальныя, тэрытарыяльныя, арганізацыйныя і іншыя ўзаемасувязі паміж іх унутранымі элементамі. У савецкай і расійскай архівазнаўчай школе базавым комплексам для рэканструкцыі лічыўся архіўны фонд. У іншых падыходах, асабліва ў апошнія дзесяцігоддзі, спектр аб'ектаў рэканструкцыі значна пашырыўся, і казаць аб архіўнай рэканструкцыі толькі як аб «рэканструкцыі архіўнага фонду» — значыць звузіць сферу яго выкарыстання, ігнаруючы актуальныя міждысцыплінарныя працэсы.

Рэканструкцыя можа быць некалькіх відаў. *Фізічная рэканструкцыя* азначае перамяшчэнне частак аднаго раней раздробненага ідэальнага комплексу дакументаў у адно сховішча. Актуальнасць такога падыходу ўзрастала пасля істотных пераўтварэнняў палітычнай ці дзяржаўнай структуры (падзелы Рэчы Паспалітай, рэвалюцыя 1917 г. і інш.), а таксама войнаў, звязаных з перамяшчэннем дакументаў. Напрыклад, у 1920-х гг. гаворка ішла аб вяртанні Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага, часткі якой з канца XVIII ст. знаходзіліся ў розных сховішчах, і неабходнасці яе фізічнага перамяшчэння і захоўвання ў адным месцы для выпраўлення гістарычнай памылкі па яе драбненні. У падручніку па архіўнай справе 1946 г. К. Міцяеў паставіў пытанне аб фізічным узнаўленні дакументальных комплексаў, пацярпелых у выніку вайны [16, с. 138—141].

Адным з варыянтаў фізічнай рэканструкцыі з'яўляецца аднаўленне ўнутранай структуры дакументальнага комплексу (фонду) з дапамогай архіўнага апісання. Афармленне (ці выпраўленне) структуры фонду адбываецца тут метадамі апісання, сістэматызацыі, перапрацоўкі вопісаў, таму такі падыход можна назваць *апісальнай рэканструкцыяй*. Прабелы ў некаторых фондах могуць папаўняцца і з дапамогай вырабу копій — *капійная рэканструкцыя*.

Паколькі фізічная рэканструкцыя — самы складаны і дарагі працэс, які закранае ў тым ліку цэлы шэраг прававых аспектаў у міжнародных адносінах, а

апісальная рэканструкцыя магчыма пры ўмове знаходжання фонду (фондаў) у адным архіве, найбольшую папулярнасць набыла *навуковая рэканструкцыя* (ідэальная — Р. Пшэласкоўскі, гіпатэтычная рэканструкцыя — М. А. Фамін, У. Н. Аўтакратаў, апісальная рэінтэграцыя — Т. М. Лапцева) [12]. Яна пачынаецца з вывучэння структуры арганізацыі-фондаўтваральніка, характарыстыкі комплексу створаных і захаваўшыхся дакументаў, іх апісання і ацэнкі як гістарычнай крыніцы. У залежнасці ад мэт і аб'екта рэканструкцыі могуць закранацца розныя аспекты і выкарыстоўвацца розныя методыкі. Навуковая рэканструкцыя асабістага архіва, напрыклад, грунтуецца на вывучэнні біяграфіі, асноўных напрамкаў дзейнасці асобы, гісторыі асабістага архіва і аднаўленні яго першапачатковага складу на падставе захаваўшыхся звестак, вызначэнні складу, паўнаты, каштоўнасці і ўліку ўсіх вядомых частак, што захаваліся.

*Віртуальная рэканструкцыя* за апошнія дзесяцігоддзі паказала сваю эфектыўнасць, паколькі яна цалкам здымае праблему фізічнага перамяшчэння, можа акумуляваць у сабе станоўчыя якасці ўсіх апісаных вышэй падыходаў, спрыяе папулярызацыі, шырокаму выкарыстанню вынікаў, стварае дадатковыя пошукавыя магчымасці, патрабуе менш рэсурсаў. Віртуальная рэканструкцыя можа ўключаць у сябе цэлы спектр методык, пачынаючы ад стварэння баз даных да 3D-рэканструкцыі.

Сярод найбольш актуальных этапаў архіўнай рэканструкцыі можна назваць наступныя: 1) рэканструкцыя дзейнасці арганізацыі або асобы; 2) рэканструкцыя структуры і функцый арганізацыі; 3) рэканструкцыя справаводства (уключаючы сістэму дакументавання, паўнату дакументавання, дакументазварот, арганізацыю працы справаводных службаў); 4) рэканструкцыя працэсу архіўнага захоўвання (складу дакументаў, паўнаты захаваных дакументаў, гісторыі захоўвання і драбнення, прынцыпаў экспертызы каштоўнасці, умоў захоўвання, напрамкаў выкарыстання); 5) апісанне дакументаў (у форме навуковага артыкула, агляду, вопісу, базы даных, адкрытай пошукавай сістэмы або інш.); 6) афармленне і прэзентацыя вынікаў рэканструкцыі для далейшага выкарыстання.

У якасці прыкладаў вырашэння задач архіўнай рэканструкцыі ў гістарычных і архівазнаўчых даследаваннях разгледзім працы, дзе ў якасці аб'екта рэканструкцыі выступілі архівы або дакументальныя зборы органаў улады і ўстаноў розных дзяржаўных утварэнняў Еўропы перыяду Сярэднявечча і Новага часу. У 1988 г. расійскі даследчык, медыявіст, спецыяліст па гісторыі Францыі перыяду Сярэднявечча Ігар Філіпаў прадпрыняў спробу рэканструкцыі раннесярэднявечнага архіва абацтва Сэн-Віктор дэ Марсель [20]. Гістарычны комплекс будынкаў абацтва размешчаны ў Марселі (Францыя), у сучаснай правінцыі Праванс-Альпы-Лазурны Бераг дэпартамента Буш-дзю-Рон на паўднёвым усходзе краіны, на яе міжземнаморскім узбярэжжы. Абацтва было заснавана ў V ст. і з'яўлялася адным з першых манастыроў Галіі. Пры Меравінгах яно стала адным з буйнейшых у краіне. Кляштар дзейнічаў да

1790 г., неаднаразова за сваю гісторыю перажыў перыяды заняпаду і росквіту, пакінуў значны след у гісторыі як рэгіёна, так і самой дзяржавы, усяго міжземнамор'я. У цяперашні час яго дакументы захоўваюцца ў архіве дэпартамента Буш-дзю-Рон у складзе фонду абацтва Сэн-Віктор дэ Марсель і налічваюць акрамя так званых рэгістраў 3140 дакументаў на пергаміне, у тым ліку 18 адзінак — старэйшых за 1000 г. і 340 адзінак — XI ст.

Аўтар грунтаваўся на ўяўленні, што любы, нават добра захаваны архіў, які сфарміраваўся ў далёкім мінулым, нельга разглядаць зараз як поўны ці такі, якім ён быў на момант завяршэння свайго камплектавання. У сувязі з гэтым адным з элементаў (этапаў рэалізацыі, задачай) метаду рэканструкцыі архіва ў І. Філіпава выступае *ацэнка ступені дэфармацыі архіва шляхам вывучэння гісторыі збору* [20, с. 202]. Шлях узнаўлення складу раннесярэднявечнага архіва, які быў абраны І. Філіпавым, *аналіз адной з яго частак і вызначэнне ступені яе рэпрэзентатыўнасці адносна рэшты збору.* Такой гіпатэтычна рэпрэзентатыўнай часткай выступілі *картулярыі* (лац. — cartulae) — зборнікі дакументаў у форме кніг, у якія ўпісваліся тэксты актаў маёмасна-прававога характару, што меліся ў арыгінале. Згодна з азначэннем, дадзеным у працы, — «кнігі-копіі сапраўдных грамат» і пры гэтым — надзвычай дакладныя адносна арыгінала [20, с. 202, 214]. Па прычыне значна меншай ступені захаванасці ўласна арыгіналаў актаў, як і саміх сярэднявечных архіваў, падобныя зборнікі ўяўляюць сабой адну з галоўных форм пісьмовых крыніц па гісторыі Францыі за азначаны перыяд. Іх агульная колькасць даволі вялікая. Па стане на канец перыяду Сярэднявечча ў некаторых буйных архівасховішчах структур касцёла Заходняй Еўропы іх колькасць даходзіла да 50 адзінак. Пытанне, якое дазваляе вырашыць такое даследаванне для архівазнаўства — у якой ступені картулярыі па сваёй паўнаце і дакладнасці могуць адлюстроўваць склад архіваў падобных сабе ўстаноў Заходняй Еўропы перыяду Сярэднявечча і быць падставай для іх рэканструкцыі? Аб'ект даследавання — архіў абацтва Сэн-Віктор дэ Марсель — быў абраны як найбольш прыдатная база ў святле апісаных патрабаванняў даследавання. У прыватнасці: 1) у ім захоўваюцца два кляшторныя картулярыі, створаныя адпаведна каля 1100 г. — так званы «Вялікі картулярый», і ў сярэдзіне XIII ст. — так званы «Малы картулярый»; 2) сам архіў — адзін з тых, што захаваўся найлепш у тым ліку ў частцы арыгіналаў грамат перыяду VIII — XI стст.; 3) захаваўся вопіс архіва па яго стане на 1569 г.; 4) існуе працяглая традыцыя выкарыстання дакументаў архіва даследчыкамі ўжо з XVII ст.,назіраецца высокая ступень уключэння іх у навуковы зварот у якасці базы крыніц даследаванняў асновы археаграфічных публікацый; 5) гісторыя самога архіва мае да пэўнай ступені распрацаваную гісторыю.

У выніку непасрэднага *вывучэння складу і структуры картулярыяў* была ўстаноўлена колькасць унесеных у іх актаў (першапачаткова было ўключана 736 дакументаў, да сярэдзіны XIII ст. колькасць склала 816 адзінак) і прынцып упарадкавання. Было ўстаноўлена, што дакументы, размеркаваныя

па дзвюх групах, падпарадкаваны наступным прыкметам: 1) аўтарская — акты аўтарства вышэйшых свецкіх і духоўных асоб у феадальнай іерархіі, што заклалі аснову манастырскай вотчыны (першая і меншая па аб'ёме частка картулярыя); 2) геаграфічная — акты, што фіксавалі факт перадачы абацтву правоў на маёмасць у канкрэтнай дыяцэзіі і парафіі.

Чарговы элемент метаду рэканструкцыі — *ацэнка ступені рэпрэзентатыўнасці «Вялікага картулярыя»*, а менавіта высвятленне прыкметы адбору арыгіналаў актаў для ўключэння ў яго, пошук адказу на пытанне, што з арыгіналаў не ўвайшло ў яго склад, але захоўвалася ў архіве на момант яго стварэння — 1100 г.? Гэта задача вырашалася шляхам *вывучэння альтэрнатыўных крыніц інфармацыі, што раскрываюць склад архіва.* Для гэтага было неабходна: 1) выявіць у архіве захаваныя на момант правядзення даследавання арыгіналы актаў, якія былі аформлены раней за час стварэння картулярыяў і сапраўды на той час уваходзілі ў склад архіва абацтва; 2) выявіць звесткі аб існаванні тых з арыгіналаў актаў, што раней захоўваліся ў архіве абацтва, але не дайшлі да нашага часу. Для вырашэння гэтай задачы таксама вывучаліся: 1) склад актаў, унесеных у «Вялікі картулярый» пазней за 1100 г.; 2) склад актаў «Малога картулярыя» сярэдзіны XIII ст. на прадмет актаў ранейшых за 1100 г.; 3) акты, вядомыя па археаграфічных выданнях і даследаваннях гісторыкаў; 4) уліковая дакументацыя архіва ці акты на знішчэнне дакументаў; 5) справаздачы біскупскіх інспекцый; 6) кнігі натарыяў, што пацвярджалі аўтэнтычнасць актаў, арыгіналы якіх трапілі ў архіў. У выніку ўдалося выявіць 307 адзінак такіх дакументаў, былі ўстаноўлены верагодныя прычыны ігнаравання складальнікамі «Вялікага картулярыя» выяўленых дакументаў: картулярый грунтаваўся пераважна на розных відах дакументаў, што афармлялі факт атрымання абацтвам зямельнай ці іншай уласнасці ў Правансе за перыяд канца X — XI ст. — так званыя traditiones; пры капіраванні ім аддавалася перавага ў параўнанні з актамі, якія пацвярджалі правы саміх традэнтаў на гэтыя ўладанні і адлюстроўвалі гісторыю здзелак іх ранейшых уладальнікаў («акты трэціх асоб»), пераважна — парафіян.

Вынікі даследавання Ігара Філіпава — важныя для высвятлення праблемы лёсу арыгіналаў актаў касцельных архіваў пасля іх капіравання ў картулярыі. Яны сведчаць, што тэндэнцыя да страты або знішчэння арыгіналаў была агульнай, але не абсалютнай*. Яна дэманструе залежнасць ад рэгіёна Еўропы — Германія і Англія або касцельныя архівы Іспаніі, Паўднёвай Францыі і

---

* «Буллы, дипломы, дарственные прелатов церкви и светских магнатов составляли важную часть архивных собраний Италии, Испании, Южной Франции, но не они, а скромные грамоты простолюдинов определяли их облик. Правда, и здесь появление картулярной копии резко ухудшало шансы подлинника на "выживание"» [20, с. 219]. «...Тот факт, что, помимо traditiones, до нас дошло крайне мало раннесредневековых южнофранцузских грамот, никак не опровергает этот тезис, поскольку речь идет о документах, уцелевших не просто случайно, а вопреки логике событий, обрекавшей их как не занесенных в картулярий на уход в небытие» [20, с. 217].

Паўночнай Італіі, дзе арыгіналаў актаў, з шэрагу занесеных у картулярыі, захавалася болей і дзе картулярый разглядаўся як спосаб больш зручнага доступу і выкарыстання арыгіналаў, не адмяняючы пры гэтым вартасці апошніх. Усплёск страты арыгіналаў адбыўся тут параўнальна позна ці нядаўна і быў звязаны з войнамі, сацыяльнымі катаклізмамі на тэрыторыі гэтых дзяржаў.

Азначаны аспект у гісторыі сярэднявечных картулярыяў мае непасрэднае дачыненне да айчыннага архівазнаўства ў кантэксце гісторыі комплексу арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння архіва вялікіх князёў літоўскіх і праблемы суіснавання дзвюх частак архіва дзяржавы — Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага і комплексу актаў у арыгінале. Па меркаванні некаторых вучоных (Эгідзіюс Банiёніс), менавіта факт наяўнасці копіі дакумента ў Метрыцы ВКЛ стаў прычынай дрэннай захаванасці арыгіналаў. Разам з тым, відавочна, што ўзнятая І. Філіпавым тэма картулярыяў у сярэднявечнай традыцыі архіўнай справы і справаводства, як, натуральна, і сама праблема рэканструкцыі заходнееўрапейскіх архіваў той эпохі, датычыцца і Метрыкі ВКЛ. Некаторыя яе структурныя элементы сапраўды дэманструюць падабенства з картулярыямі. Гэта датычыцца толькі тых відаў кніг або іх частак, што былі падпарадкаваны такім жа прынцыпам і мэтам складання: дасягненне большай зручнасці доступу да дакумента пры частым выкарыстанні; дадатковая абарона арыгінала; канцэнтрацыя ў адным месцы дакументаў, што адпавядаюць канкрэтнай тэме або віду, і інш. Прымяненне такога паняцця, як «картулярый», у дачыненні да Метрыкі ВКЛ, можна сустрэць і ў айчыннай гістарыяграфіі [17, с. 152].

Прыкладам спробы аднаўлення складу сярэднявечных дакументальных збораў у маштабе цэлага дзяржаўнага ўтварэння выступаюць працы ўкраінскага даследчыка Алега Купчынскага. Яго аўтарству належаць манаграфія пад назвай «Акти та документи Галицько-Волинського князівства XIII — першої половини XIV століть. Дослідження. Тексти» (2004), а таксама доктарская дысертацыя па спецыяльнасці «07.00.10 — Дакументазнаўства, архівазнаўства» (2006) [9; 10]. У параўнанні з разгледжаным вышэй даследаваннем у іх зроблена спроба максімальна поўнага аднаўлення складу дакументаў, што выйшлі з канцылярыі галіцка-валынскіх князёў, іншых органаў і ўстаноў названага рэгіёна Усходняй Еўропы, якія характарызуюцца надзвычай нізкай ступенню іх захаванасці. Падрабязны аналіз працы А. Купчынскага, у тым ліку з пункту гледжання падыходаў да рэканструкцыі збору, быў здзейснены намі раней [14, с. 10—14]. Тут жа ў кантэксце ўзнятай у нашым артыкуле тэмы дазволім сабе падкрэсліць, што, нягледзячы на хутчэй крыніцазнаўчыя, археаграфічныя мэты даследавання, украінскі вучоны так або інакш рухаецца ў рэчышчы архіўнай рэканструкцыі, хоць і з пэўнай спецыфікай у навуковым інструментарыі. Ва ўмовах, калі ўласна архіў Галіцка-Валынскага княства і іншыя зборы рэгіёна як самастойныя комплексы не захаваліся, амаль адсутнічаюць крыніцы даследавання іх падакументнага складу накшталт вопісаў архіва, аўтару давялося ўключаць у базу крыніц надзвычай разнастайныя, не характэрныя для архіўнай рэканструкцыі іх віды. У

працэсе фарміравання спісу «актаў і дакументаў» XIII — XIV стст.*, выяўлення звестак, што пацвярджаюць факт існавання таго або іншага дакумента, аднаўлення саміх тэкстаў дакументаў вучоны абапіраўся на 8 груп крыніц. Іх ён падзяліў у залежнасці ад прыкмет дакладнасці, паўнаты і верагоднасці на першасныя і другасныя формы: 1) першасныя формы: 1.1) арыгіналы; 1.2) спісы-копіі з арыгіналаў; 2) другасныя формы: 2.1) тэксты ў складзе пазнейшых пацвярджальных грамат; 2.2) запісы ў кнігах адміністрацыйна-судовых устаноў; 2.3) разнастайныя паводле зместу і формы даступныя на цяперашні час урыўкі, цытаты актаў і дакументаў з названай сукупнасці ў іншых гістарычных крыніцах, да якіх даследчык адносіць летапісы, летапісцы, палемічныя творы, богаслужэбную літаратуру, «дакументы розных дзяржаўных, царкоўных і царкоўна-карпаратыўных інстытуцый, а таксама прыватных асоб, якія згадваюць і цытуюць акты і дакументы Галіцка-Валынскага княства», даследчыцкія працы XV—XIX стст. па гісторыі дзяржавы, асобных яе інстытуцый, гісторыі царквы, гісторыі асобных населеных пунктаў; публікацыі дакументаў і інш.; 2.4) згадкі актаў і дакументаў з названай сукупнасці ў тагачасных або пазнейшых гістарычных крыніцах; 2.5) канцылярскія запісы і рэгесты актаў і дакументаў; 2.6) часовыя, пратакольныя запісы — «дыктаты» або «мінуты» [23, с. 5, 6, 35—36; 14, с. 12—14]. Такім чынам, даследаванне А. Купчынскага ўзбагачае арсенал сродкаў для рэканструкцыі складу дакументальных збораў, якія не захаваліся або поўнасцю страцілі сваю цэласнасць. Яно павінна разглядацца як значны навуковы ўнёсак не толькі ў крыніцазнаўства і археаграфію, але і ў тэму архіўнай рэканструкцыі ў дачыненні да аб'ектаў з тэрыторыі дзяржаўных утварэнняў Усходняй Еўропы найбольш старажытных перыядаў, у прыватнасці — да ранняга і высокага Сярэднявечча. Вопыт даследавання ўкраінскага вучонага можа быць карысным пры вывучэнні айчынных архіваў у храналагічных межах яго працы, гэта значыць у XIII—XIV стст., а магчыма і ў дачыненні да ранейшага перыяду, які ў гісторыі беларускай архіўнай справы разглядаецца як перыяд старажытнабеларускіх княстваў і пакуль знаходзіцца на мінімальным узроўні навуковай распрацоўкі.

Важнае месца ў гісторыі спроб архіўнай рэканструкцыі, звязаных непасрэдна з Нацыянальным архіўным фондам нашай краіны, займае праект па ўзнаўленні дакументальнай спадчыны вялікага князя літоўскага Вітаўта. Яна ахоплівае перыяд крыху больш позні за той, што вывучаўся А. Купчынскім, — пераважна апошняя чвэрць XIV — першая трэць XV ст., аднак стан аб'екта даследавання, падыход да яго вывучэння ў пэўнай ступені падобныя. На гэты вопыт спасылаўся і сам украінскі даследчык [36]. Ён канцэнтраваўся вакол усяго адной гістарычнай асобы як аўтара дакументаў. Аднак гэта таксама не быў праект, непасрэдна накіраваны на рэканструкцыю ўласна архіва дзеяча або дзяржавы, што ім узначальвалася. Галоўнай прыкметай адбору дакументаў

* У доктарскай дысертацыі верхняя храналагічная мяжа пашырана на ўсё XIV ст. [10].

выступала іх аўтарства, але, відавочна, што ў рэальнасці склад дакументаў, якія падлягалі б сталаму захаванню і фарміравалі б архіў манарха дадзеным параметрам не абмяжоўваўся. Ён увогуле з'яўляецца маркерам так званай выходнай дакументацыі, якая не заставалася ў надаўцы, і копія якой магла не адкладацца ў канцылярыі на гэтым этапе яе гісторыі. У такім сэнсе абраны аб'ект дэманструе штучны, умоўны характар. Ён быў, як і ў папярэднім прыкладзе, у значнай, хоць і не ў поўнай сваёй меры, ідэальнай канструкцыяй, гэта значыць, як самастойны цэласны збор у такім складзе ў гісторыі ён не існаваў. Тым не менш, у выніку даследаванняў непазбежна закранался і пытанне архіва князя, што натуральна. Рэалізацыя ідэі адбывалася ў XIX — пачатку XXI ст. калектыўнымі намаганнямі некалькіх пакаленняў вучоных, выбітных спецыялістаў у сваёй тэме (гл. працы Антонія Прахаскі, Уладыслава Сямковіча, Канстанцінаса Яблонскіса, Ежы Ахманьскага, Алега Ліцкевіча і інш.). У аснове метаду адбору дакументаў выступалі як самі дакументы, захаваныя ў арыгіналах і копіях з фондаў розных устаноў, так і іх фрагменты, згадкі аб іх у крыніцах розных відаў. У выніку чаго ўдалося выявіць значны, багаты па сваёй разнастайнасці пісьмовы матэрыял за 1376—1430 гг., пераважна — эпісталярый, прывілеі гэтага ж надаўцы, міждзяржаўныя дагаворы і інш.

Азначаныя даследаванні «вітальдыяны» маюць непасрэднае дачыненне да тэмы рэканструкцыі архіва вялікіх князёў літоўскіх. Глыбокае разуменне архіватворчых працэсаў, уласна архівазнаўчы погляд на праблему архіўнай рэканструкцыі дэманструюць даследаванні польскай і амерыканскай вучоных Ірэны Сулкоўска-Курасёвай і Патрысіі Кенэдзі Грымстэд, прысвечаныя рэканструкцыі складу Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага [25—27; 33; 34]. З пункту гледжання метадалогіі, кола крыніц, афармлення вынікаў іх можна назваць узорам навуковай архіўнай рэканструкцыі. Разглядаючы асновы рэканструкцыі, яе сыходныя параметры, вучоныя дэкларавалі важнасць такіх характарыстык архіваўтваральніка — вялікіх князёў літоўскіх і іх канцылярыі, — як функцыі манарха і канцылярыі ў дзяржаве; віды і формы дакументацыі, якія імі генераваліся; дзейнасць канцылярыі і справаводчыя працэсы ў ёй; склад і структура комплексу; архіўны ўлік і захоўванне і інш. Ключавой крыніцай тут выступаюць гістарычныя формы архіўнай уліковай дакументацыі, якія фіксуюць склад кніг Метрыкі ВКЛ у розныя перыяды, і даныя аб іх. Шляхам паслядоўнага супастаўлення іх даных адсочваецца кожная пазіцыя архіва, яе ўліковыя даныя і іншыя прыкметы, устанаўліваецца сувязь з кнігамі Метрыкі, што дайшлі да нас і зберагаюцца ў адпаведных фондах ці калекцыях сучасных устаноў, чым даказваецца або абвяргаецца іх паходжанне са складу Метрыкі ВКЛ. У асобных выпадках напрамак можа змяняцца ў адваротны бок — выяўленне даных пра вядомыя існуючыя кнігі ў старых іх апісаннях і вызначэнне сапраўднага паходжання. У аснове даследавання — глыбокі аналіз гісторыі фарміравання, захавання і працэсаў перамяшчэння масіву кніг Метрыкі ВКЛ. Вынікі даследавання афармляюцца ў спісы або табліцы, што

адлюстроўваюць склад кніг Метрыкі ВКЛ, інфармацыя аб існаванні якіх пацвярджаецца крыніцамі; уліковыя нумары, якія ім былі нададзены на розных этапах гісторыі захоўвання і зафіксаваны ў рэестрах ці іншых гістарычных апісаннях Метрыкі ВКЛ (так званы канкарданс); месцы сучаснага захоўвання і актуальныя архіўныя шыфры. Гэтыя працы добра асветлены ў гістарыяграфіі. Погляды іх аўтараў на склад архіва ВКЛ, тэрміналагічны апарат, падыходы да рэканструкцыі збору больш поўна адлюстроўваюць артыкулы аднаго з аўтараў [13; 15].

Такім чынам, разглядаючы архіўную рэканструкцыю як метад, мы паўнавартасна ўключаем яе ў структуру архівазнаўства разам з аб'ектам, прадметам, прынцыпамі і агульнанавуковымі метадамі. Паняцце метаду як сукупнасці правілаў і працэдур дазваляе выкарыстоўваць розныя яго канфігурацыі, выбіраючы аб'ект, від рэканструкцыі, колькасць этапаў і працэдуры на кожным з іх згодна пастаўленай даследчыцкай ці практычнай задачы. Архіўная рэканструкцыя непадзельна звязана з прынцыпам правеніенцыі. Яна выступае вельмі актуальным метадам для беларускіх архівазнаўцаў і архівістаў і павінна стаць больш пазнавальным канцэптам для архіўнай супольнасці, а таксама для гісторыкаў, археографаў, крыніцазнаўцаў, музеязнаўцаў, культуролагаў. Бясспрэчнай з'яўляецца яе каштоўнасць для ўжо існуючых архіўных фондаў беларускіх дзяржаўных архіўных устаноў з пункту гледжання ўзнаўлення страт, удасканалення іх унутранай структуры і інш. Яшчэ больш актуальным і перспектыўным сродкам яна выступае ў святле вяртання і аднаўлення цэласнасці архіўнай спадчыны беларускага народа, забеспячэння паўнаты Нацыянальнага архіўнага фонду Беларусі.

Літаратура і крыніцы

1. Автократов, В. Н. К вопросу о методологии архивоведения / В. Н. Автократов // Археографический ежегодник за 1969 год. — М., 1971. — С. 22—35.
2. Автократов, В. Н. О некоторых путях восстановления состава и содержания утраченных архивных фондов (на примере фонда Военного приказа) / В. Н. Автократов // Исторический архив. — 1961. — № 6. — С. 150—165.
3. Архівістика: Термінологічний словник / авт.-упорядн.: К. Є. Новохатський, К. Т. Селіверстова [та ін.]. — Київ, 1998. —106 с.
4. Архівознавство: Елементарний підручник. Ч. 1.: Посіб. для самоосвіти і для учбових закладів / авт: В. Барвінський [та ін.]. — Харків : Рад. школа, 1932. — 22 с.
5. Запартыка, Г. В. Перспектывы навуковай рэканструкцыі музея імя Івана Луцкевіча ў Вільні / Г. В. Запартыка // Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей: праблемы вяртання і сумеснага выкарыстання (юрыдычныя, навуковыя і маральныя аспекты): матэрыялы Міжнар. навук. канф., якая адбылася ў Мінску пад эгідай UNESCO, 19—20 чэрв. 1997 г. — Мінск, 1997. — С. 178—184.
6. Иванова, О. С. Эволюция архивного принципа провениенции в западноевропейской и североамериканской историографии во второй половине XX — начале XXI века / О. С. Иванова // Архив в социуме — социум в архиве: материалы четвертой Всерос. науч.-практ. конф. — Челябинск, 2021. — С. 130—134.

7. Іванова, В. С. Асабістыя архівы Беларусі канца XVIII — пач. XXI ст. / В. С. Іванова. — Мінск, 2014. — 404 с.
8. Ковальченко, И. Д. Методы исторического исследования. — М.: Наука, 2003. — 486 с.
9. Купчинський, О. А. Акти та документи Галицько-Волинського князівства XIII — першої половини XIV століть. Дослідження. Тексти / О. А. Купчинський. — Львів: Простір-М, 2004. — 1285 с.
10. Купчинський, О. А. Акти та документи Галицько-Вольнського князівства XIII— XIV століть. Дослідження. Тексти : автореф. дис. … д-ра іст. наук: 07.00.10 / О. А. Купчинський. — Київ, 2006. —35 с.
11. Курляндский, И. А. Проблемы реконструкции архивных фондов: (В работах сов. исследователей 1917—1991 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук: 05.25.02 / И. А. Курляндский. — М., 1994. — 28 с.
12. Лаптева, Т. Н. Значение термина «реконструкция архивного фонда» в отечественной историографии / Т. Н. Лаптева // Вестник архивиста. — 2018. — № 1. — С. 155—168.
13. Латушкін, А. М. Даследаванне комплексу арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння архіва Вялікага Княства Літоўскага ў працах амерыканскай даследчыцы Патрысіі Кенэдзі Грымстэд / А. М. Латушкін // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. — Мінск: НГАБ, 2020. — Вып. 18. — С. 5—17.
14. Латушкін, А. М. Комплекс арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння архіва Вялікага Княства Літоўскага ў гістарыяграфіі краін постсавецкай прасторы 1991—2020 гг.: тэрміналагічны аспект / А. М. Латушкін // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. — Мінск: НГАБ, 2021. — Вып. 19. — С. 5—27.
15. Латушкін, А. М. Комплекс арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння архіва Вялікага Княства Літоўскага ў польскай навуковай літаратуры 2-й пал. XX — пач. XXI ст. / А. М. Латушкін // Бібліятэчны веснік. — 2019. — Вып. 11. — С. 42—52.
16. Митяев, К. Г. Теория и практика архивного дела: учеб. пособие. / К. Г. Митяев. — М., 1946. — 249 с.
17. Радаман, А. А. Віленскі земскі прывілей 1565 г. вялікага князя Жыгімонта Аўгуста / А. А. Радаман // Беларускі гістарычны агляд. — 2005. — Т. 12. — Сш. 1—2. — С. 132—161.
18. Словарь современной архивной терминологии социалистических стран. Вып. II. — М., 1988. — 320 с.
19. Теория и методология науки. Терминологический словарь / отв. ред. А. О. Чубарьян. — М.: Аквилон, 2014. — 576 с.
20. Филиппов, И. С. Раннесредневековый архив аббатства Сен-Виктор де Марсель: опыт реконструкции / И. С. Филиппов // Средние века. — Вып. 51. — М. : Наука, 1988. — С. 201—221.
21. Фомин, Н. А. Систематизация архивных материалов / Н. А. Фомин // Архивное дело. — 1937. — № 2 (43). — С. 73—101.
22. Чабров, Г. Н. К вопросу о систематизации архивных материалов / Г. Н. Чабров // Ленинградский архивист. — Л., 1933. — Вып. 1. — С. 64—83.
23. Horsman, P. New Respect of the Old Order: the context of the Dutch Manual / P. Horsman, F. Ketelaar, T. Thomasen // American Archivist. — Vol. 66. — 2003. — S. 249—270.
24. Kennedy Grimsted, P. Czym jest i czym była Metryka Litewska? (Stan obecny i perspektywy odtworzenia zawartości archiwum kancelaryjnego Wielkiego Księstwa Litewskie-

go) / P. Kennedy Grimsted // Kwartalnik Historyczny. — 1985. — R. 92. — T. 1. — S. 55—83.
25. Kennedy Grimsted, P. The «Lithuanian Metrica» in Moscow and Warsaw: Reconstructing the Archives of the Grand Duchy of Lithuania. Including an annotated edition of the 1887 inventory compiled by Stanislaw Ptaszycki / P. Kennedy Grimsted, with the collabor. of Irena Sulkowska-Kurasiowa. — Cambridge, Mass.: Oriental Research Partners, 1984. — XVI, 279, 109 p.
26. Kennedy-Grimsted, P. Układ i zawartość Metryki Litewskiej / P. Kennedy Grimsted // Archeion. — 1986. — T. 80. — S. 121—182.
27. Mamczak-Gadkowska, I. Zasada przynależności zespołowej w praktyce polskich archiwów państwowych. Wprowadzenie do problematyki / I. Mamczak-Gadkowska // Zasada zespołowości w praktyce archiwów państwowych: studia i materiały / pod red. E. Rosowskiej. — Warszawa, 2017. — S. 11—27.
28. Nawrocki, S. Zagadnienie metod badawczych i metodologii w archiwistyce / S. Nawrocki // Archeion. — T. 69. — 1979. — S. 21—38.
29. Pamiętnik IV Powszechnego Zjazdu Historyków Polskich w Poznaniu 6—8 grudnia 1925. Cz. 2: Protokoły / wydał Kazimierz Tyszkowski. — 1927. — 252 s.
30. Polski słownik archiwalny / oprac. A. Bahulski, K. Kanarski, A. Wolf. — Warszawa, 1952. — 131 c.
31. Przelaskowski, R. Program prac wewnętrznych w archiwach nowożytnych / Wydawnictwa kursów archiwalnych. — Warszawa, 1935. — 55 s.
32. Robótka, H. Wprowadzenie do archiwistyki / H. Robótka. — Toruń, 2003. — 259 s.
33. Sułkowska-Kurasiowa, I. Metryka Litewska — charakterystyka i dzieje / I. Sułkowska-Kurasiowa // Archeion. — T. 65. — 1977. — S. 91—118.
34. Sułkowska-Kurasiowa, I. Nieznane egzemplarze ksiąg Metryki Litewskiej z lat 1440—1518 / I. Sułkowska-Kurasiowa // Kwartalnik Historyczny. — 1983. — R. 90. — № 1. — S. 119—126.
35. Tomczak, A. Archiwałna zasada pertynencji terytoryalnej a rozmieszczenie zasobu w archiwach polskich / A. Tomczak // Archeion. — T. 67. — 1978. — S. 7—23.
36. Vitoldiana. Codex privilegiorum Vitoldi Magni ducis Lithuaniae 1386—1430 / zebrał i wydał J. Ochmański. — Warszawa; Poznań: PWN, 1986. — 256 s.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 26.07.2023*